■ 50+: Жыць цікава

# ЖАНЧЫНА — СОЛА

## Рыжанка, якая жыве цяпер у Мінску, — пра нас і пра сябе

**Гераіня гэтага артыкула — 60-гадовая Аніта Санэ з Рыгі, якая ўжо два гады жыве і працуе ў Мінску. Жанчына аб'ездзіла больш за 50 краін, пабывала на ўсіх кантынентах, акрамя Паўднёвай Амерыкі: у Еўропе, Азіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі... Апроч саміх падарожжаў Аніта вядзе блог і інстаграм, прысвечаныя ім. У апошні час у яе шмат запісаў і фатаграфій, у якіх яна ўсяму свету расказвае пра Беларусь.**



Гэты здымак Аніты Санэ — візітоўка яе сайта.

### «Я, якая вандруе па свеце ў адзіночку»

Аніта прыехала ў Мінск у 2014 годзе, пасля таго як атрымала працоўны кантракт у чэшскай фірме, філіял якой знаходзіцца ў Мінску. Яна — дырэктар па персанале. Яе асабісты сайт мае слоган «solo female travel website», г.зн. ён — аб падарожжах жанчыны-сола — у адзіночку. «Люблю незалежнасць і свабоду, — тлумачыць наша суразмоўніца. — І я — самадастатковая асоба. Вядома, жывучы сола, нешта губляеш, але і знаходзіш таксама. Да таго ж у мяне заўсёды ёсць чым заняцца, такое мноства ідэй і праектаў, што нават не хапае часу на ўсё!»

Свой сайт Аніта стварыла ў лістападзе мінулага года, каб весці блог пра падарожжы. Вядома, гэтаму трэба было спачатку навучыцца. «Першы час было складана, — успамінае Аніта. — І я, вядома, не навучылася прафесійна праграмаваць, але сама зрабіла свой сайт і цяпер пішу і публікую ў ім свае артыкулы і фатаграфіі, магу стварыць новы раздзел, калі спатрэбіцца. А калі з'яўляецца задача, з якой я не магу справіцца, тэлефаную выкладчыцы, якая мяне вучыла, і бяру дадатковыя ўрокі».

Навошта Аніце блог, работа з якім адбірае вельмі шмат часу? Справа ў тым, што яна так многа падарожнічала і працягвае гэта рабіць, што ў рэшце рэшт захацела падзяліцца сваімі ўражаннямі, расказаць пра іх іншым людзям. «Мой моцны бок — планаванне, я заўсёды дакладна планую кожную сваю паездку. І падумала: мае маршруты могуць быць цікавымі, могуць спатрэбіцца іншым людзям», — кажа яна. Цяпер Аніта мае зносіны з трэвелблогерамі (людзьмі, што пішуць у блогах пра свае падарожжы) з усяго свету ў сацыяльных сетках. «Я шмат чаму навучылася за апошні год і вельмі рада гэтаму», — кажа наша гераіня.

Акрамя блога, яна яшчэ вядзе інстаграм. Выкладвае туды фатаграфіі і «прывязвае» да іх свае гісторыі. І блог, і інстаграм у Аніты на англійскай мове. Яна добра размаўляе на ёй, але гаварыць і пісаць — гэта розныя рэчы, тым больш для публікі, для якой англійская мова з'яўляецца роднай і якая заўважае любыя агрэхі. Таму прыйшлося дадаткова падцягваць мову. Вядома, гэта патрабуе часу. Затое цяпер у яе 12 600 падпісчыкаў і чытачоў з усяго свету, якім цікавыя яе фота — гэта ўжо дастаткова сур'ёзны ўзровень. Напрыклад, напярэдадні нашай гутаркі Аніта выклала ў інстаграме здымак Нясвіжскага палаца, і 538 чалавек з розных краін адзначылі, што ім падабаецца гэта фота.

### «Да Мінска мне здавалася, што Рыга вельмі дагледжаны горад»

Да прыезду ў Мінск два гады таму Аніта была ў Беларусі ўсяго адзін раз, яшчэ за савецкім часам. Кажа, што ў памяці засталіся шырокія вуліцы нашай сталіцы.

— Зараз я магу адзначыць тое, што, напэўна, адзначаюць усе замежнікі, якія пабывалі ў Беларусі — чысціню і парадак, — расказвае яна. — Цяпер, калі я прыязджаю ў Рыгу, адразу бачу: вось тут трава не пакошана, там будынак не пафарбаваны... А да Мінска мне здавалася, што Рыга вельмі дагледжаны горад, што ў нас усюды парадак. Але ў параўнанні з вашай сталіцай я бачу, што гэта не зусім так. У нас больш кантрастаў, бо на ўсё прыватная ўласнасць. У кагосьці з уладальнікаў ёсць сродкі на догляд за домам і падтрыманне яго ў парадку, а ў кагосьці — няма. Таму ў Рызе побач з дагледжаным будынкам можа знаходзіцца будынак у трохі занядбаным стане. А ў вас у роўнай ступені ўсё дагледжана. Прычым я шмат езджу па Беларусі і бачу, што ўсюды парадак, а не толькі ў цэнтры сталіцы. І гэта мяне здзіўляе. Гэта тое, што адразу кідаецца ў вочы...

Так, цяпер Аніта шмат падарожнічае па Беларусі. Тлумачыць: «Мне цікава глыбей зразумець краіну, дзе я цяпер жыву». Як і ў падарожжах па ўсім свеце, так і тут яна ніколі не ездзіць з турыстычнымі групамі, толькі адна: «Гэта мой спосаб падарожнічаць».

— У вашай краіны вельмі складаная гісторыя — столькі сутыкненняў, войнаў і падзелаў тут было! — кажа наша суразмоўніца. — Нядаўна я была ў Трасцянцы — яшчэ адна вельмі цяжкая старонка ў вашай гісторыі, якая ілюструе трагедыю габрэйскага народа. Зараз я рада, што ў вас аднаўляюцца сінагогі. Дарэчы, я ўпершыню ў жыцці пабывала ў сінагозе менавіта ў вас, у Гродне... А на днях я была на пешаходнай экскурсіі па Мінску, і самае вялікае ўражанне на мяне зрабіў той факт, што былі часы, калі ў горадзе ўсе надпісы былі на чатырох мовах: беларускай, рускай, польскай і ідыш!

«У вас ёсць шмат таго, што варта ўбачыць, — кажа Аніта, але наракае на вялікія адлегласці. — Беларусь — вялікая краіна, і трэба лічыцца з тым, што, каб нешта паглядзець, трэба выдаткаваць шмат часу на дарогу». А першыя месцы, з якіх яна пачала знаёмства з нашай краінай — гэта традыцыйныя Мір і Нясвіж. На іх конт у Аніты сваё меркаванне.

— Гэтыя месцы маюць доўгую гісторыю. І заўсёды ёсць пытанне, які час мы хочам «вярнуць»: 200 гадоў таму або 300, а можа, 100... Бо ў розныя часы гістарычныя месцы былі рознымі... — разважае Аніта. — Які час мы выбіраем для аднаўлення? Мяне гэтая тэма заўсёды цікавіла. Тут можа быць шмат спрэчак... Асабіста для мяне важна ў такіх месцах адчуць дух часу, павінна прысутнічаць пачуццё сапраўднага. Таму што пры рэстаўрацыі можна крыху перастарацца і зрабіць трохі прыгажэй, чым было. У Нясвіжы самае вялікае ўражанне на мяне зрабіў не палац, а магільны склеп роду Радзівілаў у Фарным касцёле — таму што там у мяне было пачуццё сапраўднага...

Пра Мірскі замак Аніта кажа, што такога нідзе не бачыла: «Ён вельмі асаблівы па сваёй архітэктуры, унікальны. Я пабывала больш чым у 50 краінах, шмат чаго бачыла, мне ёсць з чым параўнаць»...

**«Я заўсёды дакладна планую кожную сваю паездку. І падумала: мае маршруты могуць быць цікавымі, могуць спатрэбіцца іншым людзям».**

Яна з захапленнем расказвае пра сваю апошнюю паездку, якая была ў брэсцкім напрамку: «Я знайшла ў інтэрнэце здымкі Косава і вельмі захацела ўбачыць гэты палац ужывую. Там яшчэ ідзе рэканструкцыя, але тое, што зроблена, ужо ўражвае! Гэта надзіва прыгожы палац, мяне ён вельмі ўразіў».

### «Ёсць толькі адна Радзіма — свая»

У Мінску Аніта не плануе заставацца назаўсёды. «Дзе б я ні была, я добра ўсведамляю, што ёсць толькі адна Радзіма — свая краіна. У любой іншай, нават самай прыгожай, якая табе вельмі падабаецца, ты ўсё роўна будзеш чужым». І хоць Аніта сама і дзве яе дачкі жывуць у іншых краінах (адна — у Швецыі, другая — у Аўстраліі), жанчына адзначае, што ў яе ўвесь час прысутнічае пачуццё, дзе яе сапраўдны дом, і ён — у Латвіі. «Сваім ты будзеш толькі ў сваёй краіне, у іншай ты застанешся госцем, — кажа яна. — Для мяне гэта даўняя ісціна».

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*



У пустыні ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах.

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2016 года

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2016 | на 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 64 914 | 57 483 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 606 | 453 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 116 360 | 123 032 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 240 483 | 346 544 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 889 789 | 484 104 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 341 389 | 2 168 328 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 12 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 10 044 | 5 580 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 181 543 | 154 112 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 2 753 | 1 340 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 11 | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 35 512 | 34 297 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 3 883 416 | 3 375 273 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 12 834 | 2 928 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 1 716 652 | 1 551 402 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 1 665 594 | 1 394 709 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 2 671 | 2 750 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 43 333 | 32 884 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 441 084 | 2 984 673 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 117 408 | 117 408 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 47 446 | 42 027 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 73 437 | 66 602 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 204 041 | 164 563 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 442 332 | 390 600 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 3 883 416 | 3 375 273 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 9 месяцев 2016 года

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | за 9 месяцев 2016 года | за 9 месяцев 2015 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 309 688 | 260 617 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 156 820 | 144 111 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 152 868 | 116 506 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 66 160 | 58 192 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 20 857 | 18 235 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 45 303 | 39 957 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 650 | 1 035 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 96 | 543 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 10 715 | 48 727 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 137 | 702 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 68 948 | 80 082 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6 099 | 11 907 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 91 985 | 74 747 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4 764 | 5 054 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 50 171 | 59 494 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 3 691 | 11 309 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 46 480 | 48 185 |

Председатель Правления Н.В.Лузгин

Главный бухгалтер Л.А.Филиппова

Дата подписания 04 октября 2016 года

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2016 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078.